студзень 2017 /БЕЛ

# ІНФАРМАЦЫЙНЫ БЮЛЕТЭНЬ

Урбаністычныя стратэгіі, накіраваныя на супольнасці, у гістарычных гарадах (COMUS)

## Стан спраў

**Ґорыс (Арменія**
Фаза рэалізацыі праекту будзе завершана напрыканцы лютага .

PTAs (Папярэднія тэхнічныя ацэнкі ) на завяршаючай стадыі, FS (тэхніка-эканамічныя абґрунтуванні) у працэсе распрацоўкі.

**Ґюмры (Арменія)**
Фаза рэалізацыі праекту будзе завершана напрыканцы лютага. PTAs на завяршаючай стадыі, FS у працэсе распрацоўкі.

**Душэці (Грузія)**
Фаза рэалізацыі праекту будзе завершана напрыканцы лютага. PTAs на завяршаючай стадыі, FS у працэсе распрацоўкі.

**Жоўква (Украіна)**
Фаза рэалізацыі праекту будзе завершана напрыканцы лютага. PTAs на завяршаючай стадыі, FS у працэсе распрацоўкі.

**Луцк (Украіна)**
Фаза рэалізацыі праекту будзе завершана напрыканцы лютага. PTAs на завяршаючай стадыі, FS у працэсе распрацоўкі.

**Мсціслаў (Беларусь)**
Завершана Фаза планавання. Распачата Фаза рэалізацыі праекту

**Прылукі (Украіна)**
Фаза рэалізацыі праекту будзе завершана напрыканцы лютага. PTAs на завяршаючай стадыі, FS у працэсе распрацоўкі.

**Сорока (Малдова)**
Фаза рэалізацыі праекту будзе завершана напрыканцы лютага. PTAs на завяршаючай стадыі, FS у працэсе распрацоўкі.

**Чыатура (Грузія)**
Фаза рэалізацыі праекту будзе завершана напрыканцы лютага. PTAs на завяршаючай стадыі, FS у працэсе распрацоўкі.

## Асноўныя моманты



**Фаза рэалізацыі праекту** COMUS, якая была працягнута да канца лютага 2017 г., накладваецца на Фазу кансалідацыі, якая распачалася ў студзені гэтага года. На апошнім этапе Фазы рэалізацыі праекту мясцовымі экспертамі, пры падтрымцы міжнародных экспертаў, будзе завершана распрацоўка тэхніка-эканамічных абгрунтаванняў (FS). Акрамя таго, завершыцца падрыхтоўка прэзентацыйных фільмаў і буклетаў для кожнага пілотнага гораду.



**Чацвёрты рэгіянальны семінар праекту** COMUS **па пытаннях кіравання культурнай спадчынай** адбыўся ў Арменіі (Ерэван і Ґюмры, 22-23 верасня 2016 г.) з удзелам 23 прадстаўнікоў 9 пілотных гарадоў і эксперта Арганізацыі гарадоў Сусветнай культурнай спадчыны. Работа семінару вылучалася актыўнасцю і зацікаўленасцю. Абмяркоўваліся пытанні кіравання культурнай спадчынай, сучасныя праблемы, камунікацыйныя мадэлі і інструменты, методыка партнёрскага назірання, інтэграваны падыход. Было адзначана, што дэмакратычны ўдзел і захаванне правоў чалавека ў менеджменце культурнай спадчыны з'яўляецца складовай часткай палітыкі Рады Еўропы у дадзенай сферы.

**Пяты рэгіянальны семінар — Форум мэраў** адбыўся ў Грузіі (Тбілісі ды Душэці) 7-9 снежня 2016 г.), у якім удзельнічалі дзевяць прадстаўнікоў улады з пілотных гарадоў (мэры альбо іх намеснікі), нацыянальныя каардынатары ды кіраўнікі праекту COMUS . Плённая двухдзённая сустрэча завяршылася вызначэннем выразных заданняў для кіраўніцтва гарадоў на апошняй стадыі праекту і на пасляпраектны перыяд, а таксама падпісаннем супольнай дэкларацыі аб забеспячэнні наступнай палітычнай і фінансавай падтрымкі мясцоваму развіццю. З тэкстам дэкларацыі на шасці мовах можна пазнаёміцца на сайце COMUS.



**Вядучы эксперт наведаў Беларусь**, каб дапамагчы завяршыць План кіраўніцтва для г. Мсціслава і сфармуляваць парады для ажыццяўлення наступных крокаў. Пасля візіту эксперта г. Мсціслаў паспяхова завяршыў План кіраўніцтва і прыступіў да Фазы рэалізацыі праекту.



**Трэцяя сустрэча Кіраўнічага камітэту праекта** адбылася ў Грузіі (Тбілісі, 6 снежня 2016 г.). Усе ўдзельнікі станоўча ацанілі дзейнасць у рамках проекту ў 2016 г. і адзначылі значны поспех у яго рэалізацыі. Разам з тым, была выказана заклапочанасць , што засталося вельмі мала часу да канца праекта. Прадстаўнікі розных краін выказвалі прапановы аб падаўжэнні дзеяння праекта. Аднак, як патлумачыў Сакратарыят, усе праектныя заданні павінны быць завершаны і падсумаваныя да канца чэрвеня 2017 г., як і было запланавана. Прапанаваны дзве наступныя ініцыятывы па заканчэнні праекта. Удзельнікі ўсхвалілі план дзеянняў на 2017 год.



**Маніторынговая місія ЕС для ацэнкі вынікаў праекта** COMUS (ROM)**як часткі бягучай дзейнасці ЕС,** была ажыццёўлена восенню 2016 г. Поўная справаздача рыхтуецца і будзе прадстаўлены пазней, а з папярэднімі высновамі эксперт групы маніторынгу ЕС падзяліўся на Трэцяй сустрэчы Кіруючага камітэту ў Грузіі.

**Візіты міжнародных экспертаў і семінары па пытаннях тэхніка-эканамічнага абгрунтавання праектных ідэй** (FS) адбыліся ў Арменіі, Грузіі і Малдове.

**Мерапрыемствы на ўзроўні мясцовай супольнасці** прайшлі ва ўсіх пілотных гарадах з мэтай павышэння разумення значэння культурнай спадчыны і ідэй праекта COMUS, заахвочваючы мясцовыя суполкі да дзеянняў. Больш падрабязна аб гэтым чытайце на сайце праекта COMUS.

## Наступныя крокі

**Фаза кансалідацыі праекта** распачалася ў студзені 2017 года.
**Украіна**

Візіт вядучага эксперта : Луцк, Украіна (12-13 студзеня 2017 г.)
Практычны семінар па пытаннях тэхніка-эканамічнага абгрунтавання (FS) з удзелам міжнароднага эксперта, Украіна (8-10 лютага 2017 г.)

**Самаацэнка / працэс рэфлексіі** (студзень- красавік 2017 г.)

**Складанне партфоліо** для кожнага гораду проекта COMUS (студзень – красавік 2017 г.)

**Шосты рэгіянальны семінар** ‘Жыллёвыя праблемы мясцовага развіцця і фінансаванне праектаў па захаванні культурнай спадчыны "(апошні тыдзень сакавіка 2017 г. - меса будзе вызначана)

Дадатковую інфармацыю і навіны праекту COMUS можна знайсці па адрасе:
- ✓ www.coe.int/comus

COMUS